Голас Радзімы

№ 26 (2012)
25 чэрвеня 1987 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



ВА ЎМОВАХ ДАЛЕЙШАГА ПАГЛЫБЛЕННЯ САВЕЦКАЙ ДЭМАКРАТЫІ

(«Права выбару»)
стар. 3

ВЫДУМКІ РЭСТАЎРАТАРАЎ ГІТЛЕРАЎСКАЙ ФАЛЬШЫЎКІ

(«Кому служит легенда о «превентивной» войне»)
стар. 5

АДУКАЦЫЯ БЕЗ ДЫПЛОМАЎ

(«У ведаў канікулаў няма»)
стар. 7

«Маё дзяцінства» — так назвала свой малюнак 12-гадовая магілёўская школьніца Ганна ПАЎЛАВА. Маляванне — любімае захапленне дзяўчынкі. Яна займаецца ў студыі выяўленчага мастацтва ў Доме піянераў, і яе работы неаднойчы ўдзельнічалі ў выстаўках, што праводзіліся ў Магілёве. А сёлета малюнак, які вы бачыце, экспанаваўся на XXXI рэспубліканскай выстаўцы дзіцячай выяўленчай творчасці і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Мінску. Дзяўчынка адлюстравала, відаць, сябе і сваіх сяброў. Шырока адкрытыя, даверлівыя дзіцячыя вочы нібы зазірнулі табе ў душу, яны з верай і надзеяй глядзяць ў будучыню.

(Артыкул «Дзіцячы малюнак» чытайце на 6-й стар.)

КАСМІЧНЫЯ АПАРАТЫ

ПА ПРАЕКТУ «СПЕКТР»

Савецкія касмічныя апараты новага пакалення дапамогуць рэалізаваць унікальны міжнародны праект у галіне пазааатмасфернай рэнтгенаўскай і гама-астраноміі, які намечаны на пачатак 90-х гадоў. Яго абмеркаванне правялі ўдзельнікі нарады, якая праходзіла ў Інстытуце касмічных даследаванняў Акадэміі навук СССР. Сярод іх былі вядучыя вучоныя СССР, краін—удзельніц праграмы «Інтэркосмас», а таксама Вялікабрытаніі, Даніі, Італіі, Нідэрландаў, ЗША, Францыі, ФРГ, Японіі і Еўрапейскага касмічнага агенцтва.

«Поспехі касманаўтыкі адкрылі шырокія перспектывы перад многімі навуковымі напрамкамі, у тым ліку і перад астрафізікай высокіх энергій,— адзначыў на нарадзе намеснік дырэктара ІКД АН СССР В. Балебанаў.— Сёння мы можам ставіць і вырашаць такія задачы, аб якіх даследчыкі некалі маглі толькі марыць. Асаблівае значэнне ў сувязі з гэтым набывае міжнародная кааперацыя вучоных».

Новы праект носіць назву «Спектр-рэнтген-гама». Першы спадарожнік для планетных і астрафізічных назіранняў серыі «Спектр» выведзе на высокаапагейную арбіту дзве з палавінай тоны апаратуры ў 1991—1992 гадах.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ТАСС

МАНТАЖ ЗАВЕРШАНЫ

Касманаўты Юрый Раманенка і Аляксандр Лавейкін ажыццявілі другі выхад у адкрытую касмічную прастору і завяршылі мантаж новай сонечнай батарэі на базавым блоку комплексу «Мір».

У час папярэдняга выхаду 12 чэрвеня экіпажам быў выкананы першы этап работ па мантажу сонечнай батарэі.

У далейшым будуць праведзены камутацыя электрычных ланцугоў унутры базавага блока і ўключэнне змантаванай касманаўтамі сонечнай батарэі ў адзіную сістэму электразабеспячэння комплексу «Мір».

Усе намечаныя работы ў адкрытым космасе выконваліся экіпажам у цесным узаемадзеянні са спецыялістамі Цэнтра кіравання палётам і праектна-канструктарскіх арганізацый. Касманаўты прадэманстравалі высокую прафесіянальную падрыхтаванасць і майстэрства.

Павелічэнне магутнасці бартавой сістэмы электразабеспячэння дазволіць значна павысіць эфектыўнасць навукова-даследчых работ на комплексе «Мір».

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

ДНІ ІСПАНІІ

У Беларусі прайшлі Дні Іспаніі ў Савецкім Саюзе з удзелам аўтаномнай вобласці Валенсія. Яны былі арганізаваны таварыствамі «Іспанія—СССР», «СССР—Іспанія», урадам Валенсіі і Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі.

Жыхары і госці беларускай сталіцы атрымалі выдатную магчымасць лепш пазнаць Валенсію, пазнаёміцца з жыццём яе народа. У мінскім Палацы мастацтва была наладжана комплексная выстаўка, на якой экспанаваліся творы сучаснага іспанскага жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фатаграфіі, кнігі. Паклоннікаў іспанскай народнай творчасці і іспанскай музыкі чакалі сустрэчы з фальклорным ансамблем «Алімара», вядомым арганістам Вісэнтэ Росам.

У рамках Дзён адбыліся сходы і вечары савецка-іспанскай дружбы, былі прачытаны лекцыі аб гісторыі, архітэктуры, літаратуры Валенсіі. Беларускія гледачы ўбачылі іспанскія фільмы.

У сваю чаргу, іспанскія госці ў час Дзён змаглі пазнаёміцца з рознымі аспектамі савецкай рэчаіснасці, наведалі прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы ў Мінску і Маладзечне.

У будучым годзе плануюцца Дні Савецкага Саюза ў Іспаніі з удзелам Беларускай ССР.

ПРАДУКЦЫЯ НА ЭКСПАРТ

НОВЫЯ ЗАКАЗЫ

Фанерны завод вытворчага аб'яднання «Бабруйскдрэў»—даўні пастаўшчык прадукцыі ў замежныя краіны. Партнёры высока цэняць фанеру бабруйскай маркі. Вырабы прадпрыемства накіроўваюцца ў Польшчу, Венгрыю, Германскую Дэмакартычную Рэспубліку, Італію, Канаду, іншыя краіны.

Узоры прадукцыі завода штогод дэманструюцца на трох-чатырох міжнародных выстаўках-кірмашах. Нядаўна вырабы прадпрыемства экспанаваліся на выстаўцы ў іспанскім горадзе Барселоне, пасля якой бабруйскія фанершчыкі атрымалі новыя заказы.

Толькі за мінулы год для замежных спажыўцоў было адпраўлена каля дзевяці тысяч кубічных метраў прадукцыі.

ФОТАРЭПАРТАЖ





Гібкія аўтаматызаваныя комплексы з кіраваннем ад ЭВМ, створаныя на базе ўласнага машынабудавання ў Мінскім вытворчым абъяднанні «Інтэграл», выслабаняюць ад дробнай, манатоннай працы сотні работніц. Сучасныя тэхналагічныя працэсы, распрацоўка якіх вядзецца ў рамках праграмы «Перамога», дазваляюць інтэгралаўцам ствараць прадукцыю на ўзроўні сусветных стандартаў. Прадпрыемства выпускае звыш дваццаці мадэлей гадзіннікаў «Электроніка», вонкавае афармленне якіх мае каля шасцідзесяці варыянтаў. Сёлета тут плануюць асвоіць яшчэ чатыры мадэлі.

НА ЗДЫМКАХ: інжынеры-канструктары Ніна АХРАМЕНКА і Іван ПРАСТОЎ за распрацоўкай прагрэсіўных тэхналагічных працэсаў; работу сістэм аўтаматызаванага праектавання забяспечвае старшы інжынер-наладчык Валерый СКАМАРОХ.

СЕЛЬСКІЯ НАВІНЫ

Штодзённа на 95—100 гектарах скошваюць травы ў саўгасе «Эсьманы» Бялыніцкага раёна. З першага ўкосу ў гаспадарцы будзе нарыхтавана асноўная частка фуражу. А ўсяго яго намечана назапасіць у пераліку на кармавыя адзінкі па 22 цэнтнеры на ўмоўную галаву жывёлы — на 3 цэнтнеры больш, чым летась. НА ЗДЫМКУ: касавіца траў на сянаж.

ДАСЛЕДАВАННІ ВУЧОНЫХ

ЛЯСНЫЯ СУСЕДЗІ

Дрэвам, як і людзям, патрэбны добрыя суседзі. Пра гэта яшчэ раз напомніў лясок пад Мінскам, у якім вучоныя біялагічнай даследнай станцыі Акадэміі навук БССР падвялі вынік дваццацігадовай работы.

Тут сосны, бярозы, дубы, ліпы, елкі—аднагодкі. Але калі кроны адных узняліся ў неба, то другіх — выраслі толькі крыху вышэй за кусты. У чым справа? Аказваецца, на нераўнамернасць росту дрэў-дваццацігодак паўплывала суседства. Аптымальныя суадносіны парод для лесу—75 працэнтаў дуба і 25 ліпы ці 90 сасны і 10 елкі. Гэтыя дрэвы дружаць не выпадкова. Яны памагаюць адно аднаму менавіта тады, калі гэта неабходна. Прадукцыйнасць у такога лесу на 30 працэнтаў вышэй, чым у аднароднага.

КІРМАШЫ

АСОБНАЙ ЭКСПАЗІЦЫЯЙ

На традыцыйным Міжнародным гандлёва-прамысловым кірмашы ў польскім горадзе Познань, дзе ў павільёне Савецкага Саюза асобную экспазіцыю прадстаўляе Беларуская ССР, праведзены Дзень Беларусі. У прэс-цэнтры кірмашу адбылася прэс-канферэнцыя намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР Л. Фірысанава. Ён расказаў аб эканамічным і культурным жыцці рэспублікі, працэсах перабудовы і паскарэння, якія адбываюцца пасля XXVII з'езда КПСС. Было таксама падкрэслена, што беларускія прадпрыемствы, навуковыя ўстановы ахвотна падтрымліваюць і актыўна развіваюць сяброўскія, дзелавыя сувязі з ПНР.

ДАЛІКАТЭСНЫ ПРАДУКТ

ГРЫБНЫЯ АГАРОДЫ

Грыбны сезон адкрылі многія сельскія жыхары і ўладальнікі дачных участкаў Гомельскай вобласці. Каб набіраць грыбоў, ім дастаткова пабываць на... уласным агародзе, дзе ранняй вясной яны «пасялілі» грыбніцу вешанкі звычайнай. Яны набылі яе ў доследным лясгасе Гомельскага раёна, дзе супрацоўнікі Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі распрацавалі тэхналогію вырошчвання грыбоў у хатніх умовах. Пры захаванні ўсіх правіл з градкі пад акном можна сабраць да трох кілаграмаў свежых грыбоў.

Спецыялісты лясгаса вырасцілі да сезона каля дзвюх тон грыбніцы, якую могуць набыць усе жадаючыя.

ШКОЛЬНЫЯ КАНІКУЛЫ

«ХВАЛЯ» ПАД СОСНАМІ

«Блакітная хваля»—самы вялікі піянерскі лагер Гродзеншчыны—прыняў першую групу дзяцей мясцовых хлебаробаў.

У здраўніцы, пабудаванай на аб'яднаныя сродкі калгасаў, дзеці жывуць з камфортам і весела. Акрамя жылых памяшканняў, у лагеры ёсць сталовая, медпункт, невялікі кінатэатр, канцэртная эстрада, разнастайныя атракцыёны. У комплекс увайшлі таксама стадыён з футбольным полем, баскетбольная і валейбольная пляцоўкі, тэнісныя корты. Вакол лес, побач маляўнічае вадасховішча—для дзятвы сапраўднае раздолле.

За тры змены ў лагеры пабываюць больш за 500 школьнікаў. Іх чакаюць захапляючыя паходы і экскурсіі, алімпіяды і спартакіяды.

ЮБІЛЕЙНЫЯ НАБОРЫ

НА ЛЮБЫ ГУСТ

Чырвоны колер рэвалюцыі і традыцыйны беларускі арнамент злучыліся ў юбілейных наборах, выпуск якіх распачаты на Мінскай фабрыцы мастацкіх вырабаў.

На любы густ разлічана прадукцыя прадпрыемства: вышытыя льняныя ручнікі, блузы, разнастайныя сувеніры. Гасцям беларускай сталіцы асабліва спадабаюцца выкананыя ў народным стылі лялькі з ільну. Усяго на фабрыцы і яе філіялах выпускаецца больш як дваццаць відаў вырабаў. І кожны з іх будзе нагадваць нам: хутка юбілей — 70-годдзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

ГАСТРОЛІ

КУПАЛАЎЦЫ Ў МАСКВЕ

15 чэрвеня ў Маскве пачаліся гастролі Беларускага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы. Рэкламныя афішы, якія паведамілі аб маючых адбыцца гастролях, прыцягнулі ўвагу не толькі тэатральнай грамадскасці, але і ўсіх прыхільнікаў тэатральнага мастацтва сталіцы і яе шматлікіх гасцей.

15 гадоў не выступаў тэатр на маскоўскай сцэне (калі не лічыць паказу асобных спектакляў на розных фестывалях). Але ў памяці масквічоў захаваліся добрыя ўспаміны аб высокім майстэрстве купалаўцаў.

Спектаклі мінчан пройдуць на сцэне праслаўленага Дзяржаўнага акадэмічнага Малога тэатра Саюза ССР. У гастрольную афішу ўвайшлі шэсць спектакляў: «Радавыя» А. Дударава, адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР, «Дзеці сонца» М. Горкага, «Апошні журавель»—п'еса, напісаная А. Дударавым і А. Жукам па матывах аповесці А. Жука «Паляванне на апошняга жураўля», сатырычная камедыя «Мудрамер» М. Матукоўскага, адзін з апошніх драматургічных твораў В. Шэкспіра «Бура» і спектакль «Ажаніцца—не журыцца».

СФЕРА ПАСЛУГ

ДОМ ПРАДАЕЦЦА Ў МАГАЗІНЕ

У Добрушы адкрыўся магазін «Будаўнічыя матэрыялы». Тут можна купіць круглы лес, дошкі, сталярныя заготоўкі, пліты, пенасілікатныя блокі, цэглу, фанеру, дахавыя матэрыялы, аддзелачную плітку, аконнае і дэкаратыўнае шкло, цэмент, разнастайную ацяпляльную і газавую арматуру. У продажы маецца вялікі выбар лакафарбавых матэрыялаў, цвікоў, электраабсталявання, сталярных і слясарных інструментаў.

Набытыя тавары па жаданню пакупнікоў дастаўляе па ўказанаму адрасу мясцовая аўтабаза.

Такія спецыялізаваныя гандлёвыя прадпрыемствы па рэалізацыі будаўнічых і лясных матэрыялаў працуюць у 11 раёнах Гомельскай вобласці. Мантаж аналагічных гандлёвых пунктаў вядзецца ў Гомельскім, Буда-Кашалёўскім, Кастрычніцкім, Светлагорскім і Нараўлянскім раёнах. Павелічэнне іх колькасці ў Беларусі тлумачыцца шырокім размахам дачнага будаўніцтва.

ПЕРАБУДОВА І ДЭМАКРАТЫЯ

ПРАВА ВЫБАРУ

Найбольш масавай формай удзелу працоўных у кіраванні дзяржавай, у рашэнні важнейшых пытанняў грамадска-палітычнага жыцця краіны з'яўляюцца выбары дэпутатаў у Саветы, у якіх удзельнічаюць практычна ўсе паўналетнія грамадзяне нашай краіны. 21 чэрвеня мнагалюдна і ўрачыста было на выбарчых участках па ўсёй Беларускай рэспубліцы. Гараджане і сельскія жыхары, людзі маладыя і старэйшага ўзросту выбіралі сваіх паўнамоцных прадстаўнікоў у мясцовыя органы дзяржаўнай улады. З усіх дэпутатаў, абраных у мясцовыя Саветы, амаль 70 працэнтаў складаюць рабочыя і калгаснікі; амаль палавіна абраных — жанчыны; больш палавіны — беспартыйныя; кожны трэці — ва ўзросце да 30 гадоў. Аб адметных асаблівасцях сёлетніх выбараў, якія праходзілі ва ўмовах перабудовы, дэмакратызацыі ўсяго жыцця грамадства, павышэння ролі Саветаў у рашэнні пытанняў дзяржаўнага, гаспадарчага і сацыяльнага будаўніцтва, расказвае чытачам «Голасу Радзімы» сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Людміла СЫРАЕГІНА.

— Выбарчая сістэма ў Савецкай краіне забяспечвае прапарцыянальнае прадстаўніцтва ўсіх слаёў насельніцтва ў выбарных органах улады. У гэтым відавочнае і рэальнае адрозненне сацыялістычнай дэмакратыі ад дэмакратыі буржуазнай, дзе ў такіх органах улады пераважаюць прадстаўнікі эксплуататарскіх класаў.

У нашай краіне ў Саветах народных дэпутатаў на ўсіх узроўнях прадстаўлены рабочы клас, калгаснае сялянства, інтэлігенцыя, мужчыны і жанчыны, людзі маладыя і ветэраны, усе нацыі і народнасці, якія насяляюць Савецкі Саюз.

Такі састаў дазваляе дэпутатам з глыбокім веданнем справы вырашаць самыя важныя пытанні жыцця нашага грамадства і дзяржавы, улічваючы запатрабаванні і інтарэсы розных груп насельніцтва, асаблівасці кожнай нацыі і народнасці.

Наша выбарчая сістэма — гэта вялікае дасягненне сацыялістычнай дэмакратыі. Аднак яна, як і ўсе палітычныя, эканамічныя сацыяльныя інстытуты, не можа абмяжоўвацца дасягнутым, не развівацца, заставацца ўбаку ад працэсаў, звязаных з перабудовай. Яна ўдасканальваецца, убіраючы ў сябе папярэдні вопыт, улічваючы патрабаванні часу.

— Ці правільна будзе сказаць, што ідзе далейшае паглыбленне савецкай дэмакратыі?

— Іменна так. На студзеньскім (1987 года) Пленуме ЦК КПСС падкрэслівалася, што не можа быць гаворкі аб нейкай ломцы нашай палітычнай сістэмы. Задача ў тым, каб паўней выкарыстаць усе яе магчымасці з максімальнай эфектыўнасцю, напоўніць работу партыі, Саветаў, грамадскіх арганізацый глыбокім дэмакратычным зместам. У адпаведнасці з рашэннямі Пленума, сёлета у многіх выбарчых акругах у парадку эксперыменту апрабіравана тое новае, што мяркуецца ўнесці ў нашу выбарчую сістэму.

— Людміла Мікалаеўна, паколькі тэмай нашай гутаркі з'яўляюцца выбары, не маглі б вы больш дэтальна і канкрэтна спыніцца на тых новых момантах, якія характарызуюць сёлетнюю выбарчую кампанію?

—Сёлетнія выбары, як і заўсёды, праводзіліся ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. У Закон аб выбарах унесены толькі частковыя змяненні. Але ўся атмасфера, у якой яны рыхтаваліся і праводзіліся, была не такой, як заўсёды. Выбарчая кампанія была накіравана на пазбаўленне элементаў фармалізму, абыякавасці з боку выбаршчыкаў, мы імкнуліся, каб кожны адчуваў сваё дачыненне да важнай дзяржаўнай справы.

Выбары ў нашай краіне — усенародная справа. Важнейшай асаблівасцю перадвыбарнай кампаніі з'яўляецца тое, што яе арганізуюць не дзяржаўныя служачыя, як гэта прынята ў капіталістычных краінах, а выбарчыя камісіі з прадстаўнікоў працоўных калектываў і грамадскіх арганізацый. Так, у сёлетнюю выбарчую кампанію ў 36 958 абласных, раённых, гарадскіх, раённых у гарадах, пасялковых, сельскіх, акруговых і ўчастковых выбарчых камісіях у рэспубліцы працавала 409 772 чалавекі. Тут былі прадстаўлены ўсе слаі і групы насельніцтва. Многія камісіі ўзначальвалі рабочыя і калгаснікі. Напрыклад, старшынёй камісіі па выбарах у Драгічынскі раённы Савет быў электразваршчык трактарарамонтнага завода А. Вакульчык.

Дэмакратызм нашай выбарчай сістэмы найбольш ярка выявіўся на этапе вылучэння кандыдатаў у дэпутаты. Да эксперыменту на адно дэпутацкае месца, як правіла, уносілася і абмяркоўвалася адна кандыдатура, цяпер, у абсалютнай большасці,— некалькі. На 85 тысяч дэпутацкіх месцаў было прапанавана і абмеркавана амаль 150 тысяч кандыдатур.

Яшчэ і такую асаблівасць хочацца падкрэсліць. У буйных працоўных калектывах вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты праводзілася сёлета па цэхах, участках, брыгадах, на фермах. Адным словам, там, дзе будучы дэпутат працуе, дзе лепш ведаюць яго дзелавыя якасці, арганізатарскія здольнасці, маральнае аблічча. Многа было сёлета выпадкаў вылучэння кандыдатаў у дэпутаты непасрэдна ў тых месцах, дзе яны жывуць і працуюць, а значыць добра ведаюць усе праблемы, якія хвалююць выбаршчыкаў, лепш разумеюць іх патрэбы і просьбы і, натуральна, хутчэй пастараюцца выканаць іх наказы. Не фармальна, на больш высокім узроўні праводзіліся сустрэчы выбаршчыкаў з кандыдатамі ў дэпутаты. Звычайна ў час такіх сустрэч адбываўся зацікаўлены абмен думкамі па пытаннях, якія аднолькава хвалявалі абодва бакі. Кандыдат у дэпутаты, выступаючы, спыняўся, як правіла, на канкрэтных справах, якія датычыліся выбарчай акругі, вёскі, мікрараёна, гаварыў аб нявырашаных праблемах, якія хвалююць выбаршчыкаў, раіўся з імі, выказваў меркаванні, як справу паправіць. Кандыдаты ў дэпутаты часта сустракаліся з насельніцтвам у дварах, на агітпляцоўках, заходзілі ў кватэры выбаршчыкаў.

Рэдка сутыкаліся мы раней і з такой з'явай, як адвод кандыдатуры, якая прапаноўвалася. Цяпер выбаршчыкі адчувалі большую адказнасць за справу, большую зацікаўленасць. Таму былі выпадкі, і не адзінкавыя, калі не падтрымліваліся грамадзянамі кандыдатуры кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый. Нічога дзіўнага тут няма. Дэпутацкі мандат — не дадатак да пасады. Давер выбаршчыкаў трэба заслужыць добрасумленнымі адносінамі да справы.

— Вядома, што да гэтага часу ў нас праводзіліся выбары па аднамандатных акругах — адзін дэпутат ад адной акругі. Пры гэтым вылучаўся і ўносіўся ў бюлетэнь адзін кандыдат. Змены ў выбарчай сістэме, якія ў далейшым мяркуецца ажыццявіць, запатрабуюць, відаць, змены парадку выбараў?

— Закон і раней не абмяжоўваў колькасць кандыдатаў, якія вылучаліся па выбарчай акрузе, а акруговыя камісіі былі абавязаны зарэгістраваць усіх вылучаных кандыдатаў, унесці іх прозвішчы ў бюлетэнь і апублікаваць вынікі рэгістрацыі кандыдатаў. Традыцыя абмяжоўвацца адным кандыдатам ідзе не ад заканадаўства, а ад выбарчай практыкі. Традыцыя гэта ламаецца.

Сёлета ў шасці раёнах рэспублікі — Бялыніцкім, Глыбоцкім, Драгічынскім, Ельскім, Клецкім і Карэліцкім — эксперыментальна праводзіліся выбары па многамандатных акругах.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты праводзілася тут, як і ў звычайных акругах, грамадскімі арганізацыямі, працоўнымі калектывамі, сходамі грамадзян ці ваеннаслужачых. Розніца толькі ў тым, што колькасць вылучаных кандыдатаў перавышала колькасць мандатаў. У раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія Саветы на 3 344 дэпутацкія мандаты вылучана і зарэгістравана 4 280 кандыдатаў.

Выбранымі па многамандатнай акрузе сталі кандыдаты ў дэпутаты, якія атрымалі на выбарах больш паловы галасоў выбаршчыкаў. Дэпутаты, якія набралі меншую колькасць галасоў, сталі рэзервовымі дэпутатамі, адпаведнага Савета. Яны будуць прымаць удзел у рабоце Савета і яго органаў з правам дарадчага голасу, карыстацца правам дэпутацкай недатыкальнасці. Калі хто-небудзь з дэпутатаў складзе дачасна свае паўнамоцтвы, рэзервовы дэпутат, які атрымаў большую колькасць галасоў, стане дэпутатам без правядзення выбараў.

Выбары прайшлі, але аб выніках эксперыменту гаварыць пакуль што рана. На першым этапе ён дазволіў выбаршчыкам выказаць свае адносіны да больш шырокага, чым раней, кола кандыдатаў, а партыйным і савецкім органам — лепш даведацца аб волі выбаршчыкаў.

Вынікі выбараў пацверзділі: ламаюцца стэрэатыпы, ствараецца новая выбарчая практыка, якая адпавядае духу часу. У гэтым складаным працэсе адлюстроўваецца тэндэнцыя сённяшняга дня — імкненне савецкіх людзей быць прамымі ўдзельнікамі кіравання справамі грамадства і дзяржавы, іх імкненне навучыцца жыць ва ўмовах дэмакратыі, выкарыстоўваючы ў гэтых мэтах важнейшы дэмакратычны інстытут — інстытут савецкай выбарчай сістэмы.

Гутарку запісала Дзіяна ЧАРКАСАВА.

«МІНСК-126»

Вырабы Мінскага завода халадзільнікаў, акрамя СССР, добра вядомы ў 20 іншых краінах, у якія эскпартуецца да 65 працэнтаў выпускаемай на прадпрыемстве прадукцыі. Сёлета на заводзе будзе выраблена першая прамысловая партыя «фабрык холаду» новай мадэлі — халадзільніка «Мінск-126».

Гэта двухкамерны апарат агульным аб'ёмам 300 літраў (на думку спецыялістаў, халадзільнікі такой ёмістасці цяпер найбольш папулярныя). Верхняя камера аб'ёмам 60 літраў працуе як маразільнік. Тут можна забяспечыць замарожванне і доўгае захоўванне прыкладна ў 1,5 раза большай колькасці прадуктаў, чым у агрэгатах папярэдніх мадэлей. Прычым тэмпература ў камеры апускаецца да 25 градусаў марозу. Хуткае ахаладжэнне дазволіць гаспадыням больш поўна захаваць смакавыя і пажыўныя ўласцівасці мяса, рыбы, іншых прадуктаў.

Другая камера, аб'ёмам 240 літраў, працуе як звычайны халадзільнік, які, аднак, патрабуе пры эксплуатацыі значна менш увагі, чым мадэлі, што выпускаюцца сёння. Напрыклад, камера размарожваецца аўтаматычна, але для збору талай вады няма звычайнага паддона, яна выпараецца ў атмасферу з дапамогай спецыяльнай сістэмы. Для захоўвання гародніны і фруктаў, сыру і масла, мяса і рыбы, яек прадугледжаны асобныя ёмістасці.

Спадабаецца пакупнікам і дызайн «Мінска-126». У ім удала прыменены каляровыя пластмасы, на ёмістасці нанесены адпаведныя малюнкі. Дзверцы, у залежнасці ад расстаноўкі мэблі на кухні, можна навешваць як з правага, так і з левага боку халадзільніка.

«Мінск-126» стане дзевятай па ліку мадэллю хатніх «фабрык холаду», якія сыходзяць з канвеераў Мінскага завода халадзільнікаў. Цяпер у асартыменце прадукцыі прадпрыемства — халадзільнікі аб'ёмам ад 240 да 350 літраў, адна- і двухкамерныя, маразільнікі аб'ёмам ад 120 да 220 літраў. Думаецца, такая разнастайнасць здольна задаволіць густы самай патрабавальнай гаспадыні.

Дададзім, што мінскія халадзільнікі і маразільнікі былі ўдастоены многіх вышэйшых узнагарод на міжнародных выстаўках і кірмашах.

В. ЯКАЎЛЕЎ.



БАЛЬНІЦА ЯК САНАТОРЫЙ

Вялікі прыгожы будынак, фантаны, алеі блакітных елак, прыгожыя клумбы — усім гэтым Свіслацкая раённая бальніца, што на Гродзеншчыне, асацыіруецца з санаторыем. І гэта не выпадкова. Персанал лячэбнай установы, лічыць, што ад хвароб лечаць не толькі медыкаменты, але і прыгажосць, эстэтыка навакольнага асяроддзя, камфорт. Але не толькі сваім знешнім выглядам вабіць бальніца. Размешчана яна ў мясцінах, дзе, паводле архіўных дакументаў, да рэвалюцыі на 50 тысяч чалавек была толькі адна маленькая лячэбніца для сялян. Стаялі ў ёй чатыры ложкі для мужчын і два — для жанчын і дзяцей. Дапамогу насельніцтву аказвалі толькі ўрач і фельчар. У перыферыйнай Свіслацкай бальніцы робяць сёння складанейшыя хірургічныя аперацыі, паспяхова лечаць цяжкія хваробы. Высокая кваліфікацыя ўрачоў рознай спецыялізацыі, іх пастаянная прафесійная незаспакойлівасць падмацоўваюцца добрай дыягнастычнай базай. Аснашчана бальніца найноўшым абсталяваннем, ёсць лабараторыі, дзе робяцца агульнаклінічныя, біяхімічныя, бактэрыялагічныя аналізы. У клініцы шырока практыкуюцца сучасныя фізіятэрапеўтычныя метады лячэння, лячэбная фізкультура, масаж. Ёсць свая водагразелячэбніца, сауна, салярый, заканчваецца будаўніцтва комплексу для спелеатэрапіі.

Урачы бальніцы не трацяць многа часу на вядзенне гісторыі хваробы. У іх распараджэнні гуказапісваючая апаратура. Расшыфроўку запісаў неадкладна робяць у дыктафонным цэнтры.

Сёння ў Свіслацкай раённай бальніцы адначасова могуць лячыцца больш за трыста чалавек. Але галоўную сваю задачу яе ўрачы, сёстры бачаць усё ж у прафілактычнай рабоце, у папярэджанні хвароб. Яны ўжо назапасілі немалы вопыт па ранняму выяўленню хвароб, распрацавалі свае методыкі дыспансерызацыі насельніцтва.

НА ЗДЫМКУ: Свіслацкая цэнтральная раённая бальніца.

Фота У. АЛЯШКЕВІЧА.

ПІШУЦЬ ЗЕМЛЯКІ

ХЛУСНЯ ЗА... ГРОШЫ

Дарагія сябры!

Перш за ўсё хачу падзякаваць вам за газету «Голас Радзімы», якая кожны тыдзень прыносіць мне радасць, расказваючы аб маёй любімай Радзіме. З газеты я даведваюся не толькі пра жыццё Савецкай краіны, але і аб пазіцыі нашага народа на міжнароднай арэне. Пазіцыя гэта ўжо многа год застаецца яснай і пэўнай: мір на планеце. Усе нармальныя людзі могуць толькі падтрымліваць і вітаць яе. Я таксама хачу пажадаць вам вялікіх поспехаў у высакароднай рабоце ў імя захавання міру і прадухілення тэрмаядзернай вайны. Сёння няма больш важнай задачы.

Ужо многа год мы жывём у трывожнай абстаноўцы, але ўсё ж у нас ёсць падставы верыць, што сілы міру, справядлівасці і прагрэсу ў канчатковым выніку атрымаюць перамогу над сіламі змроку і чорнай рэакцыі. Усё больш людзей у розных краінах уліваюцца ў рады актыўных барацьбітоў за мір, усё больш рашуча патрабуюць яны ад сваіх урадаў пакласці канец вар'яцкай, небяспечнай гонцы ўзбраенняў. У чалавецтва ёсць нямала праблем, для вырашэння якіх вельмі б спатрэбіліся тыя сродкі, якія сёння трацяцца на зброю. Нямала яшчэ галодных і бяздомных, хворых і непісьменных. Тысячы людзей штогод паміраюць ад недаядання.

Я ганаруся тым, што такіх праблем ужо даўно няма на маёй Радзіме, что яна служыць прыкладам стварэння справядлівага для ўсіх людзей грамадства. Нас радуюць вашы поспехі, радуе і тое, што праблемы, без якіх ніколі не абыходзіцца, вы абмяркоўваеце адкрыта і шукаеце выйсце ўсім народам.

Усіх нас, суайчыннікаў, хто жыве ўдалечыні ад Радзімы, глыбока ўсхвалявала мінулагодняя трагедыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Вядома, гэта вялікае няшчасце для нашага народа. Людзям, каму давялося пакінуць родныя дамы і перасяліцца ў іншыя мясціны, можна толькі спачуваць. Такая аварыя магла б адбыцца ў любой краіне, але так паклапаціцца аб пацярпеўшых, забяспечыць людзей жыллём і ўсім неабходным маглі толькі ў Савецкім Саюзе.

На вялікі жаль, на Захадзе скарысталі чарнобыльскія падзеі для таго, каб разгарнуць чарговую кампанію злосных паклёпніцкіх нападак на Савецкі Саюз. Чаго толькі не нагаварылі мясцовыя сродкі масавай інфармацыі! І аб дзесятках тысяч ахвяр, і аб небяспецы для іншых краін, і г. д. Не адставалі ад іх і нацыяналісты ўсіх масцей тут, у Злучаных Штатах Амерыкі, ды і ў іншых капіталістычных краінах. Дагаварыліся да таго, што нібыта аварыя на атамнай электрастанцыі была зроблена спецыяльна, каб знішчыць украінскі народ. Пра гэта глупства і спрачацца не хочацца. Дастаткова толькі сказаць: нам добра вядома, што аварыя ўскалыхнула ўсю краіну і ўся наша многанацыянальная Радзіма прыняла на сябе клопат па ліквідацыі яе вынікаў, а тым, хто ў гэтым меў патрэбу, была аказана неадкладная і значная дапамога. Асабіста я, як і большасць замежных суайчыннікаў, глыбока абураны тым, да якой ступені нахабства, ілжы, бессаромнасці і нават ідыятызму дайшла антысавецкая прапаганда. Але гэта і зразумела. Уся справа ў тым, што гэтыя людзі з таго саслоўя, якое заўсёды люта ненавідзела Савецкую ўладу. Як у мінулым, так і сёння яны былі і засталіся яе ворагамі і служаць сусветнаму імперыялізму. У час вайны іх скарыстоўвалі для сваіх брудных мэт фашысты, а цяпер узяло пад сваю апеку амерыканскае ЦРУ. Час ад часу яно кідае ім мізэрныя падачкі. І вось з-за іх яны і гатовы паклёпнічаць на нашу Радзіму, на савецкі народ. Для любога разумнага чалавека відавочна: гэтыя выдумкі настолькі недарэчныя, што, як гаворыцца ў прымаўцы, нават конь смяяўся б. Але гэта не здаецца смешным гаспадарам паклёпнікаў, паколькі яны ахвотна плацяць за хлусню.

Хачу сказаць яшчэ і вось аб чым. Назіраеш гэта, і становіцца балюча і крыўдна, што тыя, хто паклёпнічае на сваю Радзіму, рэгулярна атрымліваюць ад розных спецслужб грошы і могуць даволі бязбедна існаваць у «свабодным свеце». А вось простаму народу даводзіцца апошнім часам цяжка. Колькі цяпер у Амерыцы здаровых, маладых людзей, якія атрымалі адукацыю і з'яўляюцца будучыняй краіны, а на самай справе пазбаўлены ўсякай будучыні. Яны не могуць знайсці ніякай, нават самай нізкааплатнай працы. У выніку поўнай безнадзейнасці многія прыходзяць у адчай і становяцца наркаманамі і злачынцамі. Гэта не выдумкі і не мая фантазія, а факты, з якімі нельга не лічыцца. Паводле статыстычнага даведніка, толькі ў адным Нью-Йорку налічваецца каля мільёна беспрацоўных і бяздомных. А калі ўзяць статыстыку па ўсёй краіне, па іншых капіталістычных краінах, то якая каласальная лічба атрымаецца! Аб тым, што ёсць краіны, дзе гэтых праблем няма, тут стараюцца не гаварыць. Выгадней падманваць народ, не расказваць яму праўду аб нашай Радзіме. Аднак утойваць гэтую праўду становіцца ўсё складаней. Немагчыма замоўчваць шматлікія мірныя ініцыятывы Савецкага Саюза. Многія тут пачынаюць задумвацца: як жа так, нас увесь час палохалі «савецкай ваеннай пагрозай», а СССР прапаноўвае да 2000 года знішчыць ядзерную зброю? Упэўнены, што падобныя пытанні прымусяць задумацца і аб іншым. Але сёння галоўнае—мір. Мяне радуе, што міралюбівая палітыка нашай Радзімы знаходзіць усё больш разумення і падтрымку і тут у ЗША, што людзі пачынаюць актыўней выказваць сваё імкненне жыць у міры.

Аляксандр КРАШАНІННІКАЎ.
ЗША.

САМЫ ДАРАГІ ПАДАРУНАК

На старонках «Голасу Радзімы» мы з цікавасцю чытаем, што пішуць суайчыннікі з розных краін. Асабліва нам цікава, як працуюць іх арганізацыі. Атрымліваецца як бы абмен вопытам. Не раз пісалася і аб дзейнасці Саюза савецкіх грамадзян у Бельгіі. Нашай арганізацыі мы аддаём свае сэрцы, яна збліжае суайчыннікаў, з'яўляецца для нас нібы часткай Радзімы на чужыне.

Сёння я хачу яшчэ раз сказаць аб адным з напрамкаў нашай работы, у якім мы вельмі зацікаўлены і які не змаглі б паспяхова праводзіць без сяброўскага садзеяння Беларускага таварыства «Радзіма».

Летам нашы дзеці і ўнукі адпачываюць у піянерскіх лагерах у Беларусі. Можна без перабольшання сказаць, што для нашых дзяцей гэта самы дарагі падарунак, які толькі можна прыдумаць, таму што нічога падобнага да вашых цудоўных піянерскіх лагераў ў капіталістычным свеце няма. Дзеці даведваюцца, як жывуць і адпачываюць іх савецкія равеснікі. А колькі радасці прыносіць дзяўчынкам і хлопчыкам асабісты ўдзел у канцэртах мастацкай самадзейнасці і спартыўных спаборніцтвах, паходы, гульні, піянерскія кастры!

Дома нашы дзеці з захапленнем успамінаюць сваіх савецкіх сяброў, цудоўны Мінск, экскурсіі, якія арганізоўвала для іх Беларускае таварыства «Радзіма». Аб гэтым яны расказваюць і на сходах нашай арганізацыі. Тады і мы, дарослыя, адчуваем сябе шчаслівымі. Быццам бы і да нас вяртаецца далёкае цудоўнае дзяцінства з піянерскімі лагерамі, песнямі, паходамі. Якім болем, горыччу і нянавісцю адгукаецца вайна, якая ўсё гэта адняла ў нас і разлучыла з Радзімай. Няхай будзе яна праклятая! І мы яшчэ вастрэй усведамляем: трэба зрабіць усё, што ў нашых сілах, каб у гэтых дзяцей у пажылым узросце не было такіх сумных успамінаў, каб жыццё ўсіх людзей было заўсёды мірным і шчаслівым.

Надзея СІРАБАБ.
Бельгія.

КАБ УСЕ ВЕДАЛІ

Калі здарылася аварыя на Чарнобыльскай АЭС, многія, вельмі многія ў розных краінах свету са спачуваннем аднесліся да гэтай бяды. Вялікае дзякуй хочацца сказаць замежным вучоным, спецыялістам, сотням працаўнікоў, якія памаглі нашай Радзіме ў той цяжкі час.

А колькі было злоснікаў, якія крычалі аб «страшных выніках і жахах» катастрофы. Яны сцвярджаді, што на Украіне людзі паміраюць проста на вуліцах, што ўсё нібыта заражана радыяцыяй. Ужо няма Кіева, пацярпела, маўляў, уся Беларусь.

Італьянскія газеты распаўсюджвалі інфармацыю аб тым, што радыяцыя дайшла і да Італіі. Забаранілі ўжываць малако, фрукты і гародніну. Людзі бегалі па магазінах і скуплялі кансервы. А потым прадавалі іх па павышаных цэнах. Многія нажыліся на гэтай паніцы.

Давялося тлумачыць сябрам-італьянцам, якое сапраўднае становішча ў Чарнобылі. Хоць не проста пераконваць людзей, падманутых, наскрозь ілжывай прапагандай.

Лічу, што наш абавязак—расказваць праўду аб Радзіме.

Хачу, каб усе ведалі, як мая Айчына змагаецца за мір, кліча да разрадкі ЗША і іх партнёраў.

Упэўнена, што Савецкі Саюз не дапусціць новай вайны, мір пераможа.

Леанарда МАЛЕЕВА.
Італія.

Некалькі гадоў назад у сярэдняй школе № 30 горада Мінска быў створаны ваенна-марскі музей. Вялікую дапамогу ў зборы экспанатаў аказалі вучням ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Яны падарылі музею макеты баявых караблёў, асабістыя рэчы, прыборы, сувеніры. А сёлета ветэраны вайны сталі гасцямі школьнікаў, дзе і сфатаграфаваліся на памяць.

Фота Ю. ЗАХАРАВА.

Што? * Як? * Чаму?

Новая атмасфера, якая пачала складвацца ў апошнія два гады ў савецкім грамадстве, несумненна, спрыяла актывізацыі ўсіх яго сацыяльных слаёў. У краіне зараз шырока разгортваецца дзейнасць шматлікіх клубаў, гурткоў, таварыстваў, ствараюцца новыя масавыя арганізацыі, выкліканыя да жыцця актуальнымі ўнутранымі праблемамі. Нядаўна, напрыклад, пачалі сваё існаванне

САВЕТЫ ВЕТЭРАНАЎ ВАЙНЫ І ПРАЦЫ

Яны з'яўляюцца нізавымі ячэйкамі Усесаюзнай арганізацыі ветэранаў вайны і працы, дата нараджэння якой — снежань тысяча дзевяцьсот восемдзесят шостага. На ўстаноўчай канферэнцыі ў Маскве за яе заснаванне аднадушна галасавала звыш сямісот пасланцоў з усіх братніх рэспублік СССР. Старшынёй Усесаюзнага савета ветэранаў вайны і працы — вышэйшага кіруючага органа гэтай грамадскай арганізацыі — быў выбраны наш зямляк, у мінулым першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі Кірыл Мазураў.

Чым жа канкрэтна прадыктавана патрэба ў згуртаванні ветэранаў?

У краіне сёння налічваецца 58 мільёнаў пенсіянераў, і з іх толькі пятая частка працягвае працаваць (у Беларусі адпаведна пенсіянераў звыш 2 мільёнаў чалавек, працуючых—трэцяя частка). Зыходзячы з таго, што ў СССР самы нізкі ў свеце пенсіённы ўзрост — шэсцьдзесят год для мужчыны і пяцьдзесят пяць — для жанчыны, гэта не так ужо і многа. І залучэнне як мага большай колькасці пажылых людзей у сферу актыўнай чалавечай дзейнасці з'явілася б важкім укладам у ліквідацыю агульнага дэфіцыту працоўных рэсурсаў, які мае пакуль месца ў Савецкай дзяржаве. Тым больш, што мільёны пенсіянераў захоўваюць не толькі добрую працаздольнасць, а і жаданне працаваць. Але з-за дзеючага, не зусім гібкага савецкага працоўнага заканадаўства і часта пасіўнасці з боку адміністрацыі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў жаданне ветэранаў падчас не падмацоўваецца стварэннем для іх адпаведных умоў. Саветы ж ветэранаў вайны і працы, якія арганізуюцца па тэрытарыяльна-вытворчаму прынцыпу — на фабрыках, заводах, у калгасах, саўгасах, мікрараёнах і г. д.— могуць актыўна ўздзейнічаць на працэс далучэння пенсіянераў да працы.

І ўсё ж з задач новай масавай арганізацыі на першы план выступае іншая. Гэта далучэнне людзей з вялізным жыццёвым вопытам да такой найважнейшай грамадскай, палітычнай справы, як выхаванне падрастаючага пакалення. З вышыні жыццёвага вопыту лепш відаць і пройдзены шлях, і новыя гарызонты. Вопыт жа савецкіх ветэранаў-першапраходцаў, будаўнікоў новага грамадства сапраўды унікальны. У ім спрасаваны здзяйсненні і праца тых, хто ажыццяўляў Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю і закладваў асновы сацыялізму ў першай у свеце дзяржаве рабочых і сялян, адстойваў яе ў смяротных бітвах з фашызмам і аднаўляў з руін, пакараў космас і настойліва змагаўся за мір. Ад укладу ветэранаў у немалой ступені будзе залежаць поспех перабудовы, якая ідзе зараз у савецкім грамадстве.

І яшчэ адзін з галоўных напрамкаў дзейнасці Саветаў ветэранаў вайны і працы. Гэта клопат пра лепшае задавальненне патрэб пажылых людзей, хаця тут многа ўжо і зроблена. Напрыклад, ветэранам вайны ў апошні час прадастаўлены дадатковыя льготы па аплаце жылля, камунальных паслуг, паліва, лякарстваў. А сёлета гэтымі льготамі пачалі карыстацца салдацкія ўдовы і маці. І толькі ў нашай рэспубліцы іх набралася звыш 30 тысяч чалавек. Саветы ветэранаў закліканы займацца ініцыятыўныя, прынцыповыя пазіцыі ў пытаннях, звязаных з паляпшэннем бытавога і медыцынскага абслугоўвання пенсіянераў, наладжваннем умоў для правядзення імі вольнага часу.

Трэба сказаць, стварэнне Усесаюзнай арганізацыі адбылося не на пустым месцы. З 1956 года існаваў, напрыклад, Савецкі камітэт ветэранаў вайны, які аб'ядноўваў удзельнікаў Вялікай Айчыннай — франтавікоў, партызан і падпольшчыкаў. Зараз іх толькі ў нашай рэспубліцы 334 тысячы чалавек. А ёсць жа яшчэ ветэраны партыі, камсамола, міліцыі, спорту. У апошнія гады таксама на месцах працякала дзейнасць мноства разнастайных ветэранскіх зямляцтваў, аб'яднанняў. Вось усе яны ў адпаведнасці са статутам і ўвайшлі ў склад Усесаюзнай арганізацыі ветэранаў вайны і працы.

КОМУ СЛУЖИТ ЛЕГЕНДА О «ПРЕВЕНТИВНОЙ» ВОЙНЕ

(К 46-й ГОДОВЩИНЕ НАПАДЕНИЯ ФАШИСТСКОЙ ГЕРМАНИИ НА СССР)

22 июня 1941 года фашистская Германия совершила вероломное нападение на Советский Союз. Произошло то, чего советский народ и его руководство стремились во что бы то ни стало избежать. Совершив первую в мире социалистическую революцию и осуществляя гигантскую программу построения нового общества, СССР, как никто другой, нуждался в мире. На всех международных форумах, проходивших между двумя мировыми войнами, представители Советского Союза неустанно боролись за воплощение в жизнь идеи мирного сосуществования, за создание системы коллективной безопасности. В стремлении не дать нацистскому руководству Германии повода для развязывания войны против СССР советское руководство во главе со Сталиным пошло так далеко, что даже переступило грань допустимого. Война уже была у порога, а меры по подготовке отпора агрессору по-прежнему проводились настолько сверхосмотрительно, что это наряду с другими причинами привело к трагическим для советских людей событиям начального периода Великой Отечественной войны.

Но вот парадокс: в ноте германского правительства, которую нацистский министр иностранных дел Риббентроп вручил послу СССР в Берлине 22 июня 1941 года (уже после вторжения вермахта на советскую территорию), а также в обращении Гитлера к немецкому народу утром того же дня содержались утверждения... об «агрессивности» Советского Союза, о нарушении им пакта о ненападении, о том, что русские дивизии готовились вот-вот напасть на Германию и т. п. И Германии якобы ничего не оставалось, как напасть на СССР, чтобы упредить его агрессию.

Тогда же Советское правительство в заявлении в связи с вероломным нападением фашистской Германии на СССР квалифицировало германские «обоснования» агрессии как попытку «задним числом состряпать обвинительный материал насчет несоблюдения Советским Союзом советско-германского пакта».

Да, это было именно так: фашисты хотели оправдать совершенную ими агрессию против СССР, выдвигая надуманные обвинения в его адрес. Но этот обман был разоблачен. Доказательства, представленные Нюрнбергскому трибуналу, судившему гитлеровских преступников, подтвердили, что «Германия имела тщательно разработанные планы сокрушить СССР как политическую и военную силу для того, чтобы расчистить путь экспансии Германии на Восток в соответствии с ее стремлениями...». В приговоре Нюрнбергского трибунала четко и недвусмысленно констатировалось, что выполнение Германией плана войны против СССР «началось 22 июня без какого-либо предупреждения и без тени законного оправдания. Это была явная агрессия».

Таким образом, лживость гитлеровской легенды о «превентивной» войне была давно доказана перед всем миром. Однако умереть ей не дали те, кого не устраивали итоги второй мировой войны. С их точки зрения, гитлеровская версия о «превентивной» войне против СССР хороша тем, что подкрепляет «историческим опытом» раздуваемый буржуазной пропагандой миф о «советской военной угрозе». Именно этим и объясняется тот факт, что при всей очевидности агрессивной, захватнической сущности планов германского фашизма в отношении СССР не иссякает поток литературы, в которой утверждается, что Германия «вынуждена» была начать войну против СССР в связи с угрозой, которая исходила от Советского Союза для Германии и даже для всей Европы. Опубликованная в 1961 году книга ультраправого американского профессора Д. Хоггана «Вынужденная война» (заголовок, как видим, без обиняков говорит о позиции автора) в течение первой половины 60-х годов была переиздана в ФРГ семь раз. В книге западногерманского историка-неонациста Г. Хертле «Оправдание для Германии» также утверждается, что «превентивная война Германии предупреждала гигантское советское наступление». Грубая фальшивка гитлеровцев о «превентивном характере» германской агрессии против СССР получила также довольно широкое распространение в США, Великобритании и других странах.

Домыслы, к которым прибегают современные реставраторы гитлеровской фальшивки, не заслуживают научной полемики, поскольку их лживость давно доказана. Но реанимация мифа о «превентивной» войне не безобидна: достаточно вспомнить неоднократные заявления представителей администрации США и самого президента о том, что в связи с «советской военной угрозой» они вправе нанести «превентивный», «упреждающий» ядерный удар по жизненно важным центрам СССР и других социалистических стран. Премьер-министр Великобритании М. Тэтчер на одной из последних пресс-конференций заявила, что Советский Союз «был, есть и останется угрозой Западу». Поэтому Запад должен, по ее мнению, продолжать политику с позиции силы, сохранять и совершенствовать ядерные вооружения.

Между тем именно продолжение западными странами такой политики и есть реальная, а не мифическая угроза миру. Что же касается СССР и других социалистических стран, то они, как об этом говорится в документе «О военной доктрине государств—участников Варшавского Договора», в силу самой природы социалистического общественного строя «не связывали и не связывают свое будущее с военным решением международных проблем». Они исходят из того, что в нынешних условиях применение военного пути для решения любого спорного вопроса недопустимо.

Так что если делать выводы из совершенного 46 лет назад акта агрессии против СССР, то они должны связываться не с легендой о «советской военной угрозе», а с судьбой агрессора, посягнувшего на социализм.

Павел БОБЫЛЕВ.

НА СНИМКЕ: май 1945 года. Знамя Победы над рейхстагом в Берлине.

НА ПРОСТОРАХ РОДИНЫ

АНТИЧНАЯ АНАПА

«Море смывает страданье людей»,— писал древнегреческий поэт Еврипид. Слова эти с полным правом можно отнести к Черному морю, омывающему берега Анапы—одного из крупнейших детских курортов. Все здесь как будто специально предназначено природой, чтобы радовать и исцелять: теплое море, золотые песчаные пляжи, чистый, благодаря бризам, воздух, минеральные источники, обилие солнца, живописная равнина.

Не случайно земля эта издавна привлекала людей. Неизвестно, какие племена первыми появились здесь, но благодаря археологам известна история ее заселения с VII—VI веков до н. э...

В 60-х годах в центре города рыли котлован для строительства современного здания и неожиданно наткнулись на старинные стены и обломки греческих амфор. Стройку законсервировали. Решением крайисполкома земля вокруг этого участка была объявлена заповедной и отдана в распоряжение ученых. Экспедиция Института археологии Академии наук СССР и сотрудники местного краеведческого музея приступили к раскопкам. Сюрпризы не заставили себя ждать. В руках ученых оказались находки самого высокого класса: керамика, светильники, предметы быта, скульптура. Постепенно проступали расчищенные археологами кварталы древнего города...

В VII—VI веках до н. э. в Северном Причерноморье обитали племена синдов, а на месте современной Анапы находилось поселение Синдская гавань, о которой неоднократно упоминали древние авторы. Здесь был крупный порт, через который синды вели торговлю с городами Боспорского царства (одного из первых государств на территории нашей страны).

С появлением греческих колонистов на месте Синдской гавани возник город Синд (Синдика). В IV веке до н. э. он вошел в состав Боспорского царства, наместником в нем стал Горгипп, и город получил новое название Горгиппия.

Выгодное географическое положение на берегу удобной бухты способствовало быстрому росту города. В гавань приходили корабли из далекой Эллады. В обмен на зерно, кожи, меха, соленую рыбу они привозили вино, чернолаковую посуду, оливковое масло, благовония. В первые века нашей эры Горгиппия была одним из самых богатых боспорских городов.

На центральной площади высились прекрасные храмы, посвященные Афродите—покровительнице мореходов и Посейдону—богу морской стихии. Вдоль улиц, вымощенных каменными плитами, стояли дома землевладельцев, богатых негоциантов, винодельни, мастерские ремесленников. В городе жили искусные гончары и камнерезы, судостроители и моряки, виноделы и рыбаки.

Все, что способствовало расцвету Горгиппии—удобная бухта, плодородная равнина,—привлекало и завоевателей. В первой половине III века город подвергся вражескому нашествию, был разрушен и сожжен.

Около двух тысячелетий его руины были погребены под землей.

Сегодня ученые восстановили историю древнего города, разгадали многие его тайны.

В самом центре Анапы расчищена территория античного города в 6 000 квадратных метров. По решению Совета Министров РСФСР здесь создан археологический музей-заповедник. В выставочном зале—амфоры, монеты, прекрасные коллекции терракоты и античного стекла. Во дворе музея, под деревьями, стоят каменные надгробия, саркофаги, мраморные плиты, на которых высечены царские декреты, посвящения богам и царям, списки победителей в спортивных соревнованиях. Рядом, в неглубоком котловане, видны расчищенные кварталы торгово-промышленного района античного города. И можно пройтись по мостовой, вымощенной 25 веков назад.

Дизайнеры, художники, археологи работают над созданием новой музейной экспозиции, которая свяжет в единое целое кварталы древней Горгиппии, силуэты берега, почти не изменившиеся за пролетевшие века, море, на котором когда-то белели паруса торговых судов.

Обследована только 30-я часть территории Горгиппии. Раскопки продолжаются. Археологи убеждены, что они—на пороге новых открытий.

Екатерина АЛЕКСЕЕВА,
кандидат исторических наук,
археолог.

СТРОИТЕЛЬСТВО ЖИЛЬЯ НА ТЕРРИКОНАХ

В Донецке, шахтерской столице Советского Союза, начат уникальный градостроительный эксперимент, который в случае удачи избавит город от терриконов (отвалов пустой породы, образующихся возле угольных шахт) и на многие годы решит острую для него проблему поиска свободных для застройки земель.

Идея принадлежит местному архитектору Виталию Вязовскому. Обобщив уже имеющийся опыт использования переформированных и облагороженных терриконов под зоны отдыха, он разработал технологию подготовки отвалов под жилую застройку. А их в Донецке свыше 80. Вместе с санитарной зоной они отнимают у города более 20 процентов территории. Кроме того, отвалы пустой породы серьезно осложняют экологическую обстановку в этом крупном промышленном центре СССР, знаменитом также тем, что здесь на каждого горожанина (население города свыше миллиона человек) приходится по кусту алых роз. Все дело в том, что терриконы постоянно пылят, дымят, отравляя атмосферу угарным газом.

И еще одно обстоятельство, которое побуждает местные власти заинтересованно отнестись к идее Виталия Вязовского. Это экономическая выгода. Чтобы вывезти один отвал за пределы города, расходуется до 6 миллионов рублей. Высокая себестоимость такой ликвидации сочеталась с трудным поиском подходящего места для складирования пустой породы. Проект Вязовского позволяет сократить расходы до 40—60 тысяч в расчете на один террикон.

Технологически подготовка отвала под застройку распадается на несколько этапов. Вначале террикон гасится, затем срезается и разравнивается до высоты 17—20 метров, поглащая тем самым санитарную зону, которая как правило, имеет радиус до 500 метров. Образовавшаяся площадка в дальнейшем инъектируется вяжущими растворами—глинистой, известковой и цементной пульпой—и уплотняется. Последний этап подготовки—нанесение на ее поверхность чернозема, предварительно снятого с засыпаемой санитарной зоны.

По расчетам Вязовского, переформированный и подготовленный под застройку террикон будет иметь площадь не менее 15 гектаров. В целом на отнятой у терриконов территории можно возвести дома общей площадью около 6,5 миллиона квадратных метров. Для Донецка это равно программе жилищного строительства вплоть до 2000 года.

Николай КАШАНСКИЙ.

ВЫСТАЎКА Ў ГОРАДЗЕ

ДЗІЦЯЧЫ МАЛЮНАК

Мінскі Палац мастацтва, дзе размясцілася экспазіцыя з дзвюх тысяч работ юных аўтараў, стаў сапраўдным месцам паломніцтва шматлікіх гледачоў — дзяцей і дарослых.

... Сёння звычайны будзённы дзень. Але наведвальнікаў многа. На дапамогу экскурсаводам прыйшлі педагогі Палаца піянераў і школьнікаў, мастакі.

Першае інтэрв'ю на выстаўцы з 10-гадовым мінскім школьнікам Андрэем Варавам.

— Андрэй, што табе найбольш спадабалася на выстаўцы?

— Акварэлі і малюнкі алоўкам.

— Можа, тут ёсць і твае работы?

— Няма. Але я таксама ўмею маляваць.

— А што ты любіш маляваць?

— Машыны і касмічныя апараты.

— Марыш пра космас?

— Не. Хачу быць урачом. Каб вылечыць свайго хворага дзядулю.

Інтэрв'ю другое, з інжынерам Васілём Карпоўскім з Маладзечна.

— Што прывяло вас на дзіцячую выстаўку?

— Я прыехаў сюды з сынам Алежкам. Яму ўсяго пяць. Але мы з ім патроху малюем. Аматары. Тут, я гляджу, ёсць работы такіх жа па ўзросту дзяцей, як мой сын.

— І вам тут цікава?

— Вельмі. Звярніце ўвагу, тут нямала дарослых. Ведаеце, у дзіцячым малюнку столькі першазданнай прыгажосці і гармоніі, што кожны дарослы чалавек, на мой погляд, ачышчаецца і ўзвышаецца душой, нібы вяртаецца ў сваё дзяцінства.

— Напэўна, вы, як аматар выяўленчага мастацтва, хацелі б даць свайму сыну адпаведную адукацыю? Неяк скіраваць у жыцці?

— Безумоўна. Але я не стаўлю мэтай скіраваць яго на шлях прафесійнага мастака. Мастацкая адукаванасць узбагаціць яго духоўна, пашырыць кругагляд, дапаможа жыць і працаваць па законах прыгажосці.

Інтэрв'ю трэцяе, з супрацоўніцай Палаца мастацтва А. Наркевіч.

— Чым, на ваш погляд, адметная сёлетняя XXXI рэспубліканская выстаўка дзіцячай выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці?

— Па-першае, сваімі маштабамі. Такой прадстаўнічай у нас яшчэ не было. Узрост яе ўдзельнікаў ад пяці да васемнаццаці гадоў. Па-другое, адметная яна і небывалай папулярнасцю ў гледачоў. Аб чым сведчаць шматлікія запісы ў кнізе водгукаў. На ёй, дарэчы, пабывала нямала замежных турыстаў.

За няпоўныя тры тыдні на выстаўцы прайшлі сустрэчы гледачоў з мастакамі, студэнтамі інстытута культуры, з рознымі калектывамі мастацкай самадзейнасці. Але, мусіць, найбольш значная падзея — гэта семінар выкладчыкаў школ з мастацкім і мастацка-архітэктурным ухілам, кіраўнікоў гурткоў, студый выяўленчага мастацтва, школ мастацтваў. На семінары гутарка ішла аб праблемах эстэтычнага выхавання дзяцей у Беларусі.

ПАГАВОРЫМ АБ ПРАБЛЕМАХ

У нашай рэспубліцы толькі за апошнія 15—10 гадоў адкрыліся і пачалі працаваць сотні гурткоў, студый выяўленчага мастацтва, школ мастацтваў у вялікіх і маленькіх гарадах, у пасёлках і вёсках. Дарэчы, на апошняй выстаўцы было нямала дзіцячых работ з перыферыі, з самай глыбінкі. І многія з іх камісія па эстэтычнаму выхаванню Саюза мастакоў БССР рэкамендавала для экспазіцыі музея дзіцячай творчасці, што неўзабаве будзе адкрыты ў Мінску.

Але тым не менш праблемы існуюць. Расказаць пра іх я папрасіла мастацтвазнаўцу, намесніка старшыні камісіі па эстэтычнаму выхаванню Саюза мастакоў БССР І. Назімаву.

— У нас паспяхова працуюць самыя розныя гурткі, школы і мастацкія студыі. Дастаткова прыгадаць хаця б сталічную студыю, якой амаль 20 гадоў кіруе Васіль Сумараў. Але ў гэтую студыю, як і ў іншыя, прыходзяць і займаюцца дзеці, што ўжо неяк праявілі схільнасць да выяўленчага мастацтва. А школьная праграма, на жаль, пасля трох першых гадоў навучання не прадугледжвае заняткаў па выяўленчаму мастацтву. Наогул, прэстыж урокаў малявання цяпер не на належным узроўні. Безумоўна, неабходна адзіная, усеагульная сістэма эстэтычнага выхавання, якая ахоплівала б усе слаі насельніцтва, пачынаючы з дашкольнікаў. Першы крок ужо зроблены. Музей дзіцячай творчасці /МДТ/, які цяпер ствараецца, мяркуецца зрабіць цэнтрам эстэтычнага выхавання ў рэспубліцы.

ЯКІМ БУДЗЕ ЦЭНТР?

Ён размесціцца ў дзіцячым парку імя Горкага, на беразе Свіслачы, побач з цыркам. Вось-вось пачнуцца работы па рэканструкцыі ўнутраных інтэр'ераў будынкаў будучага Цэнтра. У рэканструкцыі, абставанні яго прымуць удзел усе творчыя Саюзы рэспублікі.

Дыяпазон дзейнасці Цэнтра вельмі шырокі. Асноўнае — работа з дзецьмі. Мяркуецца стварэнне галерэі дзіцячай творчасці, арганізацыя музея народнай творчасці, розных майстэрань. А таксама дзеці змогуць тут музіцыраваць, разыгрываць сцэнічнае дзеянне, глядзець фільмы па мастацтву...

Другі момант, на якім будзе канцэнтраваць увагу Цэнтр, — работа з дарослымі, бацькамі. Мэта: даць ім магчымасць адчуць прыгажосць дзіцячага малюнка, каб праз дзіцячую творчасць далучыцца самім да свету вялікага мастацтва. Трэці — работа з настаўнікамі. Цэнтр будзе аказваць дапамогу педагогам пачатковых класаў у выкладанні малявання. Шматлікія студыі, гурткі, аб'яднанні, якія цяпер працуюць на добраахвотных пачатках, стануць філіяламі Цэнтра. Словам, дастаткова разгалінаваная сетка мікрацэнтраў будзе дзейнічаць па ўсёй рэспубліцы.

МОВА ГЭТА АДНОЛЬКАВА ЗРАЗУМЕЛАЯ ЎСІМ

Я трымаю ў руках стосік грамат, якія прыслала ў Беларускае таварыства «Дружба» са штата Тэхас арганізацыя «Рукі вакол міру». На тоненькай каляровай паперцы эмблема гэтай арганізацыі і прозвішчы беларускіх школьнікаў, чые работы дэманстраваліся сёлета на выстаўцы ў Злучаных Штатах Амерыкі. Акрамя гэтых грамат, у адрас Таварыства прыйшло пісьмо. «Шчыра дзякуем за работу, якая сведчыць аб вялікай увазе да дзіцячай творчасці і да выхавання дзяцей у рэспубліцы. Мы лічым, што абмен дзіцячымі малюнкамі садзейнічае развіццю ўзаемаразумення, дружбы і міру паміж народамі».

Цікава, што паслалі ў далёкую Амерыку юныя мастакі? На малюнках былі любімыя настаўнікі нашых дзяцей, школа, бацькі, дом, у якім жывуць, сябры, выгадаваныя імі хатнія жывёлы, сельскія і гарадскія краявіды Бацькаўшчыны. Пра што думалі амерыканскія хлопчыкі і дзяўчынкі, якія разглядалі гэтыя малюнкі? Вельмі шкада, што мы не маем сведчанняў таго, якое адкрыццё зрабілі для сябе юныя грамадзяне Амерыкі, калі глядзелі трохі наіўныя малюнкі сваіх равеснікаў з далёкай для іх Беларусі. Але, думаецца, перакладчык ім быў не патрэбны, і яны добра зразумелі, што ў іх шмат агульнага з незнаёмымі хлопчыкамі і дзяўчынкамі.

Неўзабаве ў параднёным з Мінскам англійскім горадзе Націнгеме адкрыецца выстаўка малюнкаў з Беларусі. У Індыю, ФРГ, Ісландыю, дзе сёлета будуць праводзіцца Дні Савецкага Саюза, з міжнароднай місіяй міру зноў адправяцца работы беларускіх школьнікаў.

Таццяна АНТОНАВА.

НА ЗДЫМКАХ: у зале выстаўкі; кампазіцыя па казцы «Курка-раба». Калектыўная работа ўдзельнікаў гуртка мастацкай цацкі Рэспубліканскага Палаца піянераў і школьнікаў у Мінску; Іна ДАВЫДАВА, 14 год. «Брэст будучыні».

Фота С. КРЫЦКАГА.



ТАМ, ДЗЕ КРЫНІЧКА ПАЭТА

У Ракуцёўшчыне, у мясцінах, звязаных з імем класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча, адбылося нядаўна свята паэзіі і песні. Мінула 70 гадоў з таго часу, як перастала біцца сэрца паэта, але яго светлая муза і сёння адухаўляе наша жыццё. Пра гэта ў сваіх выступленнях гаварылі старэйшы паэт, залужаны работнік культуры рэспублікі Максім Лужанін, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Данута Бічэль-Загнетава, паэты Уладзімір Паўлаў, Галіна Каржанеўская, Валянціна Аколава, дырэктар Літаратурнага музея імя М. Багдановіча В. Хадкевіч. Прафесійныя артысты і самадзейныя выканаўцы Маладзечаншчыны таксама прымалі ўдзел у свяце, якое стала ўжо традыцыйным.

ЗНАЙСЦІ КАНТАКТЫ

У мінскім Доме літаратара пісьменніца Святлана Алексіевіч сустрэлася з групай турыстаў з Федэратыўнай Рэспублікі Германіі, у складзе якой былі педагогі, гісторыкі і рэлігійныя дзеячы. Госці задалі пісьменніцы шмат пытанняў. Асабліва цікавілі праблемы захавання міру на зямлі, адлюстравання іх у літаратуры пра вайну.

«Такія сустрэчы дапамагаюць устанавіць сяброўскія кантакты, знайсці ўзаемаразуменне паміж людзьмі»,— заявілі прадстаўнікі групы.

У ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ ПУШКІНА

Чарговы раз прайшло па краіне Усесаюзнае пушкінскае свята. Не абмінула яно і вёску Цялуша, што на Бабруйшчыне. Тут у дзень нараджэння вялікага рускага паэта гучалі яго вершы—як у арыгінале, так і ў перакладзе на беларускую мову.

У Цялушы пахавана Наталля Аляксандраўна Варанцова-Вельямінава, дачка старэйшага сына паэта Аляксандра Аляксандравіча Пушкіна. Не першы год у гэтых мясцінах праходзяць мерапрыемствы, прысвечаныя памяці паэта. Сёлета да жыхароў раёна прыязджалі паэты Ала Канапелька і Яўген Міклашэўскі.

ВЫЦІНАНКІ ДОРАЦЬ РАДАСЦЬ

Няпросты заказ атрымаў мастак-афарміцель Ружанскага гарпасялковага Дома культуры Юрый Малішэўскі. Для музея старажытнабеларускай культуры Акадэміі навук БССР ён рыхтуе калекцыю выцінанак. Складаныя кампазіцыі выконваюцца мастаком з паперы пры дапамозе вострага ляза.

Старадаўнім мастацтвам выцінанкі, некалі шырока распаўсюджаным у народзе, зацікавіў Малішэўскага маскоўскі мастак М. Варанецкі. Захапленне перарасло ў сістэматычную працу, якая дае цудоўны плён. Работы мастака закуплены Брэсцкім краязнаўчым музеем, Ялцінскім музеем народнай творчасці, экспанаваліся ў Брэсце, Кобрыне.

Выцінанкі Малішэўскага—частка створанага ім у Доме культуры этнаграфічнага салона. Тут збіраецца моладзь на заняткі студыі маладых мастакоў, якую таксама стварыў Ю. Малішэўскі.

НАРОДНЫ УНІВЕРСІТЭТ — АДНА З ФОРМ ПАВЫШЭННЯ КУЛЬТУРЫ І АДУКАЦЫІ

У ВЕДАЎ КАНІКУЛАЎ НЯМА

Шырокі кругагляд, інтарэсы савецкіх людзей... Яны тычацца самых розных галін: культуры, мастацтва, эканомікі, палітыкі, медыцыны... Каб задаволіць іх, мы маем шмат бібліятэк, разнастайных клубаў, аматарскіх аб'яднанняў. Сярод многіх форм павышэння культурнага і адукацыйнага ўзроўню вылучаюцца народныя універсітэты.

Народны універсітэт — установа навучальная, але своеасаблівая і спецыфічная. Пасля яе сканчэння выпускнікі не атрымліваюць дыпломаў і прафесій, хаця вучацца тут па два-тры гады. Што ж даюць людзям такія заняткі? Галоўнае — магчымасць атрымаць новыя веды, сустрэцца з сябрамі па інтарэсах, пазнаёміцца з цікавымі асобамі — вучонымі, пісьменнікамі, артыстамі...

У БІБЛІЯТЭЦЫ ПАСЛЯ РАБОТЫ

Народны універсітэт культуры і эстэтычнага выхавання пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы адкрыўся ў 1980 годзе. На яго двух факультэтах — літаратуры і выяўленчага мастацтва — займаецца больш за 200 мінчан: рабочых, служачых, інжынераў, нямала вучняў старшых класаў школ. Сярэдні ўзрост слухачоў недзе каля трыццаці пяці год. Адукацыя — ад вышэйшай да незакончанай сярэдняй.

Для школьнікаў зараз прызначаны спецыяльны курс «Мастацтва і жыццё». На занятках юнакі і дзяўчаты больш падрабязна, чым на ўроках у школе, знаёмяцца з выяўленчым мастацтвам, удзельнічаюць у творчых дыскусіях і абмеркаваннях, сустракаюцца з папулярнымі мастакамі, наведваюць Мастацкі музей БССР, вернісажы ў Палацы мастацтва. За два гады моладзі было прачытана каля дваццаці лекцый вопытнымі, кваліфікаванымі мастацтвазнаўцамі, у госці да іх прыходзілі сакратар праўлення Саюза мастакоў Беларусі У. Стальмашонак, мастачка Н. Шчасная, графік з Маладзечна А. Пашкевіч, які паказаў свае работы, прысвечаныя Максіму Багдановічу, маладыя беларускія мастакі...

Але асабліва цікава і разнастайна працуе факультэт літаратуры, дзе сумесна з гарадской арганізацыяй Таварыства аматараў кнігі арганізаваны курс «Чалавек і кніга». Асноўная задача тут вызначаецца так: пазнаёміць з найбольш значнымі навінкамі савецкай, у тым ліку і беларускай літаратуры, даць практычныя звесткі і парады па кнігазнаўству і бібліяграфіі, культуры чытання, фарміраванню асабістых кніжных збораў.

Зараз намеснік дырэктара бібліятэкі і адначасова рэктар універсітэта Людміла Сулохіна і яе калегі ўжо думаюць пра будучую восень, яшчэ раз удакладняюцца планы заняткаў, карэкціруюцца з улікам пажаданняў, выказаных слухачамі універсітэта на заключнай канферэнцыі ў канцы навучальнага года. Ідуць перагаворы з вопытнымі лектарамі. Звычайна яны згаджаюцца ахвотна: ва універсітэта ў купалаўскай бібліятэцы — трывалы аўтарытэт. Ніколі не адмаўляюць у дапамозе універсітэту супрацоўнікі Інстытута літаратуры АН БССР. На факультэце літаратуры ўсе часта прыгадваюць вядомага даследчыка гісторыі беларускай літаратуры А. Мальдзіса і яго вельмі цікавыя лекцыі «У пошуках старажытных кніг і рукапісаў». Прайшлі сустрэчы з супрацоўнікамі часопісаў «Неман» і «Маладосць». А адно з нядаўніх заняткаў адбылося ў тэатры імя Янкі Купалы, дзе слухачы універсітэта паглядзелі новы спектакль «Апошні журавель», пасля якога гутарылі з адным з аўтараў сцэнарыя А. Дударавым і рэжысёрам Андросікам, артыстамі тэатра.

Зараз у народным універсітэце пачаліся канікулы. Але яго слухачы па-ранейшаму частыя госці ў бібліятэцы. Канікулаў у ведаў не бывае.

ХТО АДКАЖА НА ПЫТАННІ ЧАСУ

На магілёўскім заводзе «Тэхнапрыбор» працуюць пераважна жанчыны, у якіх звычайна галоўны клопат — сям'я, дзеці. Але ўжо пяць год на прадпрыемстве дзейнічае народны універсітэт, дзе многія з іх самыя актыўныя слухачкі. Тут за аснову ўзята правіла: весці размову пра ўсё, што хвалюе рабочага чалавека, бо профіль гэтага універсітэта — грамадска-палітычны. Кіруе ім на грамадскіх пачатках з вялікай уласнай зацікаўленасцю начальнік аднаго з аддзелаў завода Уладзімір Камінскі.

— Ці ахвотна ідуць на заняткі універсітэта рабочыя? — спытала я Камінскага.

— Магу сцвярджаць: дабравольна і ахвотна. Па-першае, мы стараемся, каб тэмы заняткаў былі заўсёды актуальныя, нават злабадзённыя, і чалавек мог гаварыць аб набалелым, высветліць усё, што хвалюе яго сёння, разабрацца ў незразумелым. І людзі на гэта адгукаюцца. Па-другое, у цэлым наш універсітэт дае слухачам шмат новай інфармацыі, пашырае круг іх інтарэсаў, выводзіць на больш высокі ўзровень разумення і тлумачэння розных жыццёвых з'яў, карацей, развівае чалавека духоўна, фарміруе ў яго актыўную грамадзянскую пазіцыю. А гэта ў сваю чаргу ўлічваецца пры рэгулярных атэстацыях работнікаў на прадпрыемстве разам з яго кваліфікацыяй, дзелавымі, арганізатарскімі якасцямі.

Так, народны універсітэт на заводзе «Тэхнапрыбор» вызначае свой профіль як грамадска-палітычны. І вывучаюць тут савецкі лад жыцця. Ахоплівае гэты курс тэмы самыя розныя: палітыка ўрада як знешняя, так і ўнутраная, пытанні далейшай дэмакратызацыі савецкага грамадства, вывучэнне заканадаўства, знаёмства з дэмаграфічнай сітуацыяй у краіне, акрамя таго, даецца ацэнка і тлумачэнне яшчэ не вырашаным праблемам у жыцці краіны, рэспублікі, свайго горада. Нярэдка заняткі прымаюць форму дыскусіі, з выразна акрэсленымі пазіцыямі абодвух бакоў. На лекцыі запрашаюцца выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, спецыялісты розных профіляў, якія маюць цікавую і абавязкова дакладную інфармацыю.

Пасля гутаркі Уладзімір Дзям'янавіч паказаў мне спартыўны комплекс, які знаходзіцца побач з прахадной завода і куды можа прыйсці перад ці пасля змены кожны рабочы, новы дом, куды вельмі хутка пераедуць дзесяткі сем'яў работнікаў «Тэхнапрыбора», прайшлі каля нядаўна пабудаванага інтэрната, дзе жывуць маладыя сем'і, пакуль не падыдзе іх чарга на атрыманне кватэры...

У заводскім дзіцячым садзіку нас сустрэла вельмі абаяльная і добразычлівая загадчыца Ніна Шамшурка. Яна і ўсе выхавальніцы добра знаёмы з Уладзімірам Камінскім: яны таксама на працягу некалькіх год былі слухачамі народнага універсітэта, сумесна працуюць і зараз.

У кабінеце Ніны Васільеўны на невялікім століку сярод кніг па педагогіцы ляжаў вельмі папулярны ў чытачоў штотыднёвік «Аргументы и факты». У яго звычайна невялікіх па памерах артыкулах даюцца тлумачэнні і адказы на самыя розныя пытанні чытачоў з сферы сацыяльнай, эканамічнай, грамадска-палітычнай, міжнароднай.

— Ніна Васільеўна, а якое прымяненне ў паўсядзённым жыцці знаходзяць веды, атрыманыя на занятках?

— Я буду гаварыць з пункту гледжання сваёй справы. Усе разумеюць, што выхоўваць дзяцей — гэта значыць не толькі іх накарміць, дагледзець, забавіць. Нават маленькіх, як нашы, дзетсадаўскія. Мы павінны закласці ў іх і пэўныя маральныя паняцці, даць неабходную колькасць сацыяльнай інфармацыі, безумоўна, у межах патрэбнага і зразумелага ім. А для гэтага выхавальнік і сам павінен быць чалавекам адпаведна падрыхтаваным. Напрыклад, Ірына Бужынская. Ёй толькі дваццаць чатыры гады, але яна ўжо знаёма многім педагогам Магілёва, бо мае вельмі цікавы ўласны вопыт па мастацкаму выхаванню дзяцей, развіццю ў іх добрага эстэтычнага густу.

Высокая культура, адукаванасць, грамадска-палітычная актыўнасць і мужчын, і жанчын, і моладзі — справа надзённая, асабліва сёння, калі ў нашай краіне пачата перабудова ўсіх сфер жыцця. Дапамагчы ў яе вырашэнні — галоўная задача народных універсітэтаў.

Галіна УЛІЦЁНАК.

КАР'ЕРА МІКАЛАЯ ЯРОМЕНКІ

КОЖНЫ РАЗ УСЁ СПАЧАТКУ

Тыя, хто бачыў Мікалая Яроменку ў фільме «Піраты XX стагоддзя» (карціна паказвалася ў дзесятках краін), будуць напэўна нямала здзіўлены, даведаўшыся, што гэты 38-гадовы маскоўскі акцёр, які сыграў тут спрытнага і бясстрашнага старшага механіка, супермена ў стылі Бельмандо, у сябе на радзіме набыў папулярнасць і такімі глыбокімі, інтэлектуальнымі ролямі, як, скажам, Жульен Сарэль у экранізацыі «Чырвонага і чорнага» Стэндаля ці выдатны піяніст Аляксандр Гальдэнвейзер у фільме «Леў Талстой».

Дарэчы, абедзве гэтыя карціны паставіў Сяргей Герасімаў — рэжысёр, які стаў для Яроменкі больш чым педагогам (Мікалай быў яго студэнтам у маскоўскім кінаінстытуце) — Настаўнікам. Герасімаў (які адкрыў у свой час для кінематографа і бацьку Мікалая — Яроменку-старэйшага — вядомага тэатральнага акцёра з Мінска) змог убачыць у сваім студэнце не проста прыгожага маладога чалавека, які мог бы бесклапотна штампаваць ролі «герояў-любоўнікаў», — ён убачыў у ім цікавую асобу. На другім курсе Яроменка зняўся ў карціне Герасімава «Ля возера». І хоць роля была невялікая, а побач дзейнічалі такія магутныя акцёрскія індывідуальнасці, як Шукшын і Жакаў, работа юнага Яроменкі запомнілася. Сыграў ён тут у многім самога сябе — закаханага хлопца з гарэзлівымі вачамі. І ў фільме Барыса Яшына «Лівень» можна было пазнаць Яроменку з калідораў кінаінстытута — крыху хуліганістага, які ў перапынках паміж лекцыямі спяваў задзірыстыя частушкі...

Ролей было многа, іграў іх Яроменка лёгка і весела, яго пазнавалі на вуліцах, дзяўчаты пісалі яму захопленыя пісьмы, аднак першая сапраўдная творчая вяршыня была дасягнута праз сем год пасля дэбюта. Размова ідзе пра Жульена Сарэля ў тэлевізійнай версіі рамана Стэндаля.

Пачынаючы гэтую работу, Яроменка не мог не думаць пра тое, што гледачы, вядома, помняць Сарэля, сыгранага выдатным майстрам Жэрарам Філіпам у фільме Клода Атан-Лара. Зрэшты, 27-гадовы маскоўскі акцёр і не спрабаваў нікога перасягнуць. Ён сыграў іншага Жульена — у нечым, магчыма, больш зямнога, больш сучаснага, і зацвердзіў за сабой права ўласнага прачытання класікі. «Мне было цікава ісці за «літарай» рамана, — скажа потым Мікалай. — Успомніце, у Стэндаля Жульен выпісаны ўвесь, да самых дробных адценняў пачуццяў. Ён сам сябе сканструяваў — замкнёнага ў кальчугу недаступнасці эгацэнтрыка, для якога няма нічога больш страшнага, чым дазволіць каму б там ні было зазірнуць у душу. І толькі перад смерцю, калі рушыцца створаная ім жа канструкцыя, Сарэль нарэшце агаляе ўласнае «я», так глыбока схаванае, што ён іншы раз і сам забываў пра яго існаванне».

Адразу пасля поспеху, як надакучлівая ідэя, узнікла пагроза самапаўтору. Катэгарычна адмаўляючыся ад ролей, якія хоць у нечым нагадвалі Жульена, Яроменка вырашыў паспрабаваць сябе ў новай якасці: сыграў рэцыдывіста па мянушцы Цыган у дэтэктыве «Карчма на Пятніцкай», рамантычнага князя Балхоўскага, які ўмее элегантна біцца на дуэлі, у фільме «Эскадрон гусар лятучых»... І нямала іншых падобных ролей. У гэтай чарадзе вылучаецца, безумоўна, старшы механік з «Піратаў XX стагоддзя», дзе Яроменка прадэманстраваў прыгажосць фізічна натрэніраванага цела: ён рабіў рызыкоўныя трукі ў моры і на сушы (і заўсёды без дублёраў), даказаўшы ўсім (і сабе, па-першае), што «і такое можа». І хоць пасля гэтага баевіка чытачы папулярнага часопіса «Советский экран» назвалі Яроменку лепшым акцёрам года, ён цвёрда вырашыў больш не здымацца, па яго выказванню, у «мускульных фільмах».

І зноў выпрабаванне. На гэты раз рускай гісторыяй. У дылогіі Сяргея Герасімава «Юнацтва Пятра» і «У пачатку слаўных спраў» Яроменка іграе хітрага і спрытнага царадворца Аляксандра Меншыкава — блізкага сябра і паплечніка Пятра I. І зноў — своеасаблівае творчае спаборніцтва: у фільме «Пётр I», пастаўленым Уладзімірам Пятровым у канцы 30-х гадоў, Меншыкава іграў выдатны акцёр Міхаіл Жараў. Але і тут Яроменку ўдаецца даказаць права ўласнага прачытання. У адрозненне ад Жарава, які іграў цалкам сфарміраванага чалавека, які спасціг мудрасць законаў двара, Меншыкаў Яроменкі толькі пачынае спасцігаць гэтыя законы. Надзіва цікава сачыць, як крок за крокам Меншыкаў-Яроменка станавіўся ўсё больш мудрым і небяспечным, як гэты выканаўца Пятровай волі, з хітраватымі мужыцкімі вачамі, вырастаў у значную і грозную фігуру.

Пасля ролі такога маштабу і псіхалагічнага напружання Яроменка, сцвярджаючы, што «трэба быць розным», са шчырым задавальненнем іграе ва ўмоўна-прыгодніцкай стужцы «Медны анёл», паказваючы заўзятага злодзея Вальдэса, які, аднак, і ў агні не гарыць і ў вадзе не тоне.

Цяпер прынята падкрэсліваць, што сучасны акцёр абавязкова, маўляў, сам рэжысіруе сваю ролю, спрачаецца з пастаноўшчыкам, адсюль, напэўна, імкненне многіх таленавітых акцёраў пайсці ў рэжысуру. Мікалаю Яроменку такое імкненне не ўласціва. Ён выдатны выканаўца, здольны растварыцца ў рэжысёрскай задуме, данесці да гледача іменна рэжысёрскую канцэпцыю героя. Гэта зусім не значыць, што Яроменка пазбаўлены самастойнасці ў рабоце над роллю, не, «несці адказнасць за сваю работу і за свой творчы лёс, быць у поўнай меры аўтарам сваіх ролей» — яго прынцып. І ў гэтым сэнсе Яроменка — заўсёды паўнапраўны сааўтар рэжысёра. Але — як акцёр са сваім бачаннем свету, вобраза, са сваімі акцёрскімі здольнасцямі ўвасаблення гэтага вобраза на экране.

Работа Яроменкі ў тэлеверсіі славутага рамана Жуля Верна «Дзеці капітана Гранта», па-мойму, здзівіла і азадачыла сваёй абсалютнай непадобнасцю да ўсяго таго, што раней рабіў на экране. Упершыню ў жыцці артыст іграў ідэальнага станоўчага героя — храбрага, дужага, добрага, адданага Гленарвана.

— Я дастаткова добра сябе ведаю, — гаворыць акцёр, — і мне было зразумела адразу, што такім дабрадзейным я не быў нават пры нараджэнні. Больш таго, я з цяжкасцю магу знайсці прыклад сярод знаёмых. Сыграць поўную дабрадзейнасць у наш рацыянальны, скептычны век, ды так, каб не было ні смешна, ні сумна, — гэта, скажу вам, задача не з лёгкіх. Я вельмі ўдзячны рэжысёру Станіславу Гаварухіну: ён своечасова ўбачыў у маім акцёрскім багажы тое, што я сам нават не заўважаў. Своечасова таму, што надышла пара, калі можна было «спачываць на лаўрах», а акцёру абавязкова патрэбны перыядычныя ўзрушэнні, каб збіваць напрацаванае, спрабаваць усё спачатку. Я дрэнна разумею, што азначае для акцёра «знайсці сябе», але цвёрда ведаю, што гэта працэс бясконцы. Бясконца фарміраванне акцёра, і лепш, на мой погляд, памерці, яшчэ фарміруючыся, чым цвёрда ведаць, што сфарміраваўся.

Вера ЖАЛТОВА.

крынічка

Анатоль ГРАЧАНІКАЎ

ДРУЖБАКІ

Сябравалі
Змалку ўтрох:
Дзіма,
Яша
І Цімох.
Праўда
У прымаўцы гучыць:
Іх вадою
Не разліць!

Пройдзе лета.
Прыйдзе час —
Пойдуць дзеці
У першы клас.

Толькі
Як рашыць задачу!
Кожны хлопчык
Ледзь не плача.
Ходзяць
Чуткі ўжо наўкруг:
Там усе
Сядзяць па двух.

Калі сядуць
Дзіма, Яша —
Што Цімох

Пра гэта скажа!
Калі —
Дзіма і Цімох —
Яша б сам
Сядзець не змог.

А з Цімохам
Сядзе Яша —
Дзіма
Што пра гэта
Скажа!

Словам,
Як ты ні круці,
Цяжка выхад
Ім знайсці.

Не сумуйце,
Дружбакі!
Верце,
Гэты час настане,
Калі першы клас
Такім,
Як вы самі,
Дружным стане!

Васіль ХОМЧАНКА

НАШ СУП

Каця і я надумалі зварыць суп на абед і пачаставаць бацьку і маці. Каця была за старшага повара, а я ёй памагаў.

— Навучу цябе кухарыць,—сказала сястра,—спатрэбіцца.

Мы наскрэблі бульбы, нарэзалі морквы, цыбулі, усё гэта паклалі ў каструлю, залілі вадой, на газ паставілі.

— Цяпер запамінай, што я далей буду рабіць,—сказала Каця.

Я глядзеў, запамінаў, паўтараў. Каця паклала ў каструлю два лаўровыя лісцікі, і я паўтарыў тое ж самае, толькі паклаў удвая болей, смачней будзе. Каця кінула некалькі бубачак чорнага перцу, і я, калі яна адлучылася з кухні, гэта паўтарыў.

Перад тым, як зняць суп з агню, Каця ўсыпала лыжку солі, паспытала на смак, сказала, што суп амаль гатоў. І пачала расстаўляць талеркі для абеду.

Я таксама паспытаў на смак суп. Здалося, што ён недасолены, і я ўсыпаў у яго яшчэ солі.

Прыйшлі бацька з маці. Каця разліла суп у талеркі і запрасіла ўсіх абедаць.

Уселіся за стол. Бацька сербануў нашага супу, зморшчыўся і апусціў лыжку ў талерку. Маці таксама зморшчылася.

— Хто ў вас галоўны повар?—спытаў бацька.
— Я,—адказала Каця.
— А я ёй памагаў,—сказаў я.
— Як памагаў?
— Рабіў тое, што і Каця. Яна кінула лаўровы ліст і перац, і я кінуў. Яна пасаліла, і я пасаліў.
— Ну тады ўсё зразумела,—сказаў бацька.

І я сербануў супу. І мне захацелася зморшчыцца і выліць назад у талерку, бо рот апякло перцам, і суп быў перасолены. Але праглынуў. Сам жа гатаваў, значыць, трэба есці.

Я еў, і Каця ела, і абое не моршчыліся.

Бацьку і маці, відаць, усё ж сорамна стала, што мы ядзім, а яны грэбуюць нашым супам. Пачалі і яны есці. Так і з'елі ўвесь суп.

Вера ВЯРБА

СУНІЧКА

Сунічка пашыла спаднічку
Пад колер чырвонай зары.
Нібыта маленькая знічка
Гарыць на паляне ў бары.

Прыбегла хітруха-лісічка,
І вожык прытупаў стары.
Дзівіліся ўсе на сунічку:
І кветкі, і нават звяры.

Дзяўчынка паставіла кошык,
З сунічкі не зводзіць вачэй.
Дзяўчынка падумала трошкі:
— Хай спее на сонцы яшчэ!

А дзве белабокі-сястрычкі
Здалёку трашчаць, з гушчара:
— Сунічка надзела спаднічку!
Чырвонага лета пара!

Ніл ГІЛЕВІЧ

ЗЁЛКІ

Заўтра я павінна ўстаць
Раненька, з зарою:
Пойдзем зёлкі мы збіраць —
Людзям на здароўе.

Святаяннік, дзівасіл,
Сухацвет і піжму —
Каб было на лекі ўсім —
Буду рваць я ўвішна.

Палячыцца каб маглі
Сталыя і дзеці
Сокам роднае зямлі,
Што сабраны ў цвеце.

Каб адчулі ўсе душой,
Колькі сілы-моцы
У лясной і лугавой
Беларускай зёлцы!

Сяргей ТАРАСАЎ

МУЗЫЧНАЯ НОТА

КАЗКА

Жыў на свеце трубач. Аднойчы прыйшоў дадому, паставіў сваю трубу на акно. Акно было расчынена, а на вуліцы гуляў лёгкі ветрык. Убачыў ветрык на акне трубу, зацікавіўся: «Што гэта такое? У коміны хат і вялікіх заводаў я дзьмуў, а вось у такую трубу—не». Разбегся ветрык, сабраў усю сваю моц і дзьмухнуў. З трубы выскачыла Нота і паляцела ў свет.

Ляцела, ляцела і прыляцела да дома, дзе жыў чалавек, які піша музыку,—кампазітар. Заляцела Нота ў фортку. Бачыць: стаіць на раялі разлінеены сшытак, а ў ім—поўна нот. І наша Нота села паміж імі.

— До-фа-мі-рэ-соль-сі-до! Ля! Што такое?—здзівіўся кампазітар.—Адкуль узялася гэта нота? Паспрабуем яшчэ раз: Соль-сі-до! Ля! Не, яна не павінна тут быць! Вось жа стаіць нота «рэ». До-фа-мі-рэ. Соль-сі-до-рэ! Зараз мы гэта «ля» выкраслім.

Спалохалася Нота і хуценька выскачыла ў акно.

— Ух ты!—уздыхнула з палёгкай.—Гэтак і сапраўды могуць выкрасліць.

Ляціць Нота далей. Раптам чуе—музыка гучыць. Агледзелася, а гэта—тэатр. Заляцела Нота ў тэатр. А там на сцэне аркестр. А нотаў над ім—што машкары. Раптам наперад выйшаў спявак з доўгай барадою і пачаў спяваць басам.

«Вось каму я, відаць, патрэбна»,—падумала Нота.

А спявак браў голасам усё вышэй і вышэй:—А-а-а! А-а-а!—І раптам нізкае:—У-у-у!

Ад нечаканасці ён змоўк. Збянтэжыўся і аркестр. Спявак здзіўлена азірнуўся, не разумеючы, як гэта ў яго атрымалася.

Спалохалася Нота: і тут яна не на сваім месцы. І, каб ніхто не заўважыў,—шусь у акно!

Ляцела і думала, што трэба, відаць, вяртацца дадому, да свайго музыкі. Але раптам апынулася каля школьнага акна. Зазірнула туды. А там каля чорнай разлінеенай дошкі стаіць дзяўчынка і плача, а дошка спісана нотамі.

— У цябе ўсё добра, Аленка,—кажа настаўніца,—толькі ў другім такце не хапае адной ноткі. Падумай, не хвалюйся...

Пачула гэта Нота, прыгледзелася да дошкі. І сапраўды, у адным месцы зверху ёсць нота і знізу ёсць, а пасярэдзіне—пуста. Нядоўга думаючы, скокнула яна на гэта месца і сцішылася.

— Не плач, Аленка,—кажа настаўніца.—Паглядзі на дошку ўважліва... Але што гэта?—здзівілася яна і надзела акуляры.

— Яе ж, здаецца, не было. Цяпер тут сапраўды ўсё правільна. Стаўлю табе «выдатна».

Яна раскрыла Аленчын дзённік і паставіла пяцёрку.

А дзяўчынка ўзяла крэйду і падмалявала Ноту.

«Вось дзе я патрэбна!»—падумала Нота і засталася ў школе.

Пераправа.

Фота І. ВАКУЛІЧА.

ЛІЧЫЛКІ

Раз!— лічу.
Два!— лічу.
Раз чытаю,
Два чытаю
Чытаю і яшчэ хачу —
На памяць кніжку завучу...

***

Восем Маш
І восем Мішак
Прынеслі па восем кніжак.
Сталі дружна іх лічыць:
— Раз! Два! Тры!
Чатыры! Пяць!..
— Твая якая?
— Тая, што з краю.
— На!..

***

Кар! Кар! Кар!
Ішла варона на базар.
А потым — з базара:
Кніжкі раздавала.
Гэтую — дзеду!
Гэтую — суседу!
Гэтую — табе!

***

Ішоў пекар па панелі,
Нёс бублік у партфелі,
Партфель парваўся,
Бублік згубіўся.
Хто бублік знойдзе,
Той і кніжку прачытае!
Вось!..

***

Праз сад-гарод
Бег рыжы кот.
Даганяў мышку,
А знайшоў кніжку.

ХВІЛІНКІ-ВЕСЯЛІНКІ

Хвалько кажа хвальку:
— Чуў пра Атлантычны акіян!
— Чуў.
— Я пераплыў яго.
— А ты чуў пра Мёртвае мора!
— Чуў.
— Я яго забіў.

***

Трохгадовая Ірынка мяшае лыжкай суп, глядзіць, як віецца пара над талеркай.
Бабуля пытаецца:
— Унучка, чаму ж ты не ясі!
Ірынка адказвае:
— З супу пыл ідзе.

***

Маці ўшчувае сына-гультая.
Сын апраўдваецца:
— Мамачка, чаго ты крычыш! Я ж нічагусенькі не рабіў!

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:
МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 992